*Г.А. БЫСТРОЎ*

# МАРАЛЬНА-ЭСТЭТЫЧНАЕ ВЫХАВАННЕ БУДУЧЫХ КІРАЎНІКОЎ МУЗЫЧНЫХ КАЛЕКТЫВАЎ

Эфектыўнасць уздзеяння музыкі на фарміраванне асобы разумелі ва ўсе часы, ва ўсіх краінах і грамадствах як у свецкім, так і ў рэлігійным ужыванні, у час вайны і міру. Развіццё сродкаў масавай камунікацыі, выхад музыкі за сцены канцэртных залаў, магчымасць адначасовага ўздзеяння на многамільённыя аўдыторыі – усё гэта дазваляе выкарыстоўваць яе ў фарміраванні маральна-эстэтычных і культурных каштоўнасцей грамадства [2, с. 10].

У наш час, на жаль, шырока распаўсюджана так званая масавая культура. Многія мастацтвазнаўцы, вучоныя і грамадскія дзеячы справядліва выказваюць думкі аб тым, што яна атупляе свядомасць чалавека, адцягвае яго ад грамадскіх інтарэсаў, ад роздуму над вострымі праблемамі сучаснасці. У такім выпадку наносіцца значная шкода духоўнаму свету чалавека, яго маральным перакананням.

У часткі сучаснай моладзі назіраюцца павярхоўныя адносіны да музыкі. Яны выкліка્ны пакланеннем перад модай, спрашчэннем ідэйнага зместу музычнага твора. Мода аблягчае выбар эстэтычных каштоўнасцей з шырокай палітры музычнага мастацтва. Але пастаяннае прытрымліванне моды можа пазбавіць маладога чалавека эстэтычнай патрабавальнасці. Больш таго, “прэстыжны” падыход да музыкі зводзіць яе да ўзроўню сродку эгаістычнага самасцвярджэння. Спажывецкія, утылітарныя адносіны да музыкі часцей за ўсё ўзнікаюць там, дзе эстэтычныя густы маладых людзей не маюць цвёрдай асновы. Рок-музыка патрабуе самай пільнай і зацікаўленай увагі, сумленнай і адкрытай інфармацыі, арганізацыйных мер па фарміраванні яе маральна-эстэтычнай накіраванасці. Вядома, не трэба адхіляць рок толькі таму, што ён прыйшоў да нас з Захаду. Але гэта зусім не азначае, што ў рок-музыцы трэба ўсё падтрымліваць і безагаворачна прымаць. Галоўнае – заўважыць у вялізным яе патоку тое лепшае, што адказвае патрабаванням, якія прад’яўляюцца да любога твора мастацтва.

Спасцігнуць гэтыя патрабаванні, зразумець прыгажосць твора моладзь зможа ў працэсе сур’ёзнай работы з ёю. Значную ролю ў вырашэнні гэтай праблемы мае ўдзел выкладчыкаў і студэнтаў у стварэнні на прадпрыемствах, у школах, сярэдніх і вышэйшых навучальных установах клубаў аматараў музыкі. Стварэнне маладзёжных клубаў аматараў музыкі дапаможа грамадскім аб’яднанням вырашаць не толькі пытанні арганізацыі вольнага часу, але і эфектыўна ўплываць на маральна-эстэтычнае выхаванне моладзі. У клубах можна праводзіць сустрэчы з творчымі дзеячамі, абмяркоўваць праблемы формы і зместу музычных твораў, фарміраваць грамадскае меркаванне наконт тых ці іншых музычных захапленняў, весці шчырую размову аб музычных калектывах, развіваць эстэтычны густ і маральна-эстэтычныя погляды моладзі. Шмат вольнага часу моладзь прысвячае музыцы. Таму неабходна, шырока выкарыстоўваючы розныя формы музычнага выхавання (не выключаючы, вядома, і дыскатэкі), зрабіць вольны час насычаным і цікавым, карысным для моладзі.

Важную ролю ў далучэнні дзяцей і юнацтва да вялікага мастацтва іграюць філарманічныя канцэрты. У гэтым выпадку вельмі важна, каб праграмы канцэртаў не складалі бессістэмна, фармальна, таму што гэта адбіваецца на іх наведванні. Нягледзячы на значную работу філармоніі па прапагандзе музычнага мастацтва, многія школьнікі і студэнты ні разу не былі на канцэртах сімфанічнай музыкі. Распаўсюджванне білетаў на гэтыя канцэрты праходзіць з вялікай цяжкасцю як у школах, так і ў ВНУ.

Музычнае выхаванне не можа развівацца паспяхова, калі не абапіраецца на трывалую тэарэтычную базу, мастацтва прапагандыста і кіраўніка, якія знаходзяцца ў прамой залежнасці ад узроўню падрыхтоўкі музычных работнікаў. У музычных каледжах і акадэміі музыкі, на музычных кафедрах універсітэта культуры і педагагічных ВНУ навучанне музыцы павінна быць накіравана не толькі на фарміраванне ў студэнтаў прафесійных ведаў, уменняў і навыкаў,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

але і на выпрацоўку ў іх маральна-эстэтычных перакананняў, на развіццё здольнасцей арганізатарскай і выхаваўчай работы з людзьмі.

На жаль, педагогі па навучанні ігры на музычных інструментах і выкладчыкі спецыяльных дысцыплін ва ўсіх звёнах – ад музычнай школы да музычных аддзяленняў ВНУ – не выкарыстоўваюць у поўнай меры магчымасці духоўнага развіцця навучэнцаў. Недастаткова ўвагі надаецца развіццю музычна-вобразнага мыслення навучэнцаў, якія часцей за ўсё толькі эмацыянальна ўспрымаюць змест музычнага твора, не асэнсоўваюць яго як факт мастацтва, не даюць яму маральна-эстэтычнай ацэнкі. Між тым спецыфіка ідэйна-эмацыянальнага выхавання – ва ўзаемадзеянні эстэтычных і маральных пачуццяў. Азнаямленне з музычнай літаратурай, работа над асобнымі творамі, асэнсаванне высакародных пачуццяў, якія яны выклікаюць, маюць велізарнае значэнне ў выхаванні студэнтаў.

Эфектыўнасць уздзеяння музычнага твора на моладзь залежыць ад многіх фактараў, і ў першую чаргу ад мастацкай вартасці і ідэйнай накіраванасці твора. Якасць музычнай інфармацыі, змястоўная напоўненасць, ідэйная афарбаванасць уздзейнічаюць як на эстэтычнае, так і на агульнае развіццё маладога чалавека. Важнейшым сродкам, што рэалізуе маральна-эстэтычныя функцыі музыкі, з’яўляецца вучэбны рэпертуар, які дапамагае пазнаць яе прыгажосць, выразнасць музычнай мовы, разнастайнасць жанраў і формаў класічнай і прагрэсіўнай сучаснай музыкі розных краін і народаў. Передавое музычнае мастацтва ўвасабляе ў сабе крыніцы нацыянальнай і інтэрнацыянальнай творчасці, высокія гуманістычныя ідэалы, адлюстроўвае новыя сацыяльныя і маральныя праблемы, тэмы, ідэі і вобразы.

Вучэбны рэпертуар павінен не толькі забяспечваць прафесійную падрыхтоўку студэнтаў, а ў аматарскіх калектывах развіваць здольнасці іх удзель-нікаў, але і садзейнічаць развіццю, актывізацыі такіх духоўных якасцей, як патрыятызм, гуманізм, дабрыня, спагадлівасць і інш. Вось чаму на індывідуальных і групавых занятках асаблівую увагу неабходна надаваць выхаваўчаму зместу музыкі. Рэпертуар павінен таксама фарміраваць эстэтычныя адносіны навучэнцаў да сучаснай музыкі. Правільны падбор вучэбнага рэпертуару ў вялікай ступені выяўляе арганізацыю будучай дзейнасці музычнага кіраўніка [4, с. 6–10]. Неацэннае значэнне тут маюць творы народнай творчасці, іх арыгінальныя апрацоўкі.

У іх адлюстроўваюцца не толькі перажыванні, пачуцці, думкі і імкненні асобных людзей, але і гісторыя, быт, духоўнае багацце народа. Народныя мелодыі даюць жывое і вобразнае ўяўленне пра багацце і своеасаблівасці нацыянальных рыс і характару народа. Выкарыстанне народных мелодый з’яўляецца важнейшым сродкам адаптацыі новых гучанняў і адначасова адным са сродкаў забеспячэння масавасці, папулярнасці твора. Вядомы ансамбль “Песняры” прадэманстраваў плённасць пераінтанавання элементаў рок-музыкі на аснове беларускага фальклору, ён адыграў вялікую ролю ў станаўленні новых элементаў нацыянальнай музычнай культуры. Пошукі “Песняроў” падтрыманы і прадоўжаны ансамблем “Сябры”. Увогуле для развіцця маладзёжнай музычнай культуры ўласцівае паступовае праяўленне эстраднасці: відовішчнасці, яркасці, гульні і інш.

Вялікае значэнне ў вучэбна-пазнавальным і маральна-эстэтычным выхаванні навучэнцаў і моладзі маюць творы кампазітараў-класікаў, паколькі ў іх раскрываюцца нацыянальныя традыцыі, адлюстроўваюцца важнейшыя грамадска-палітычныя з’явы, існуе цесная ўзаемасувязь з дэмакратычным рухам эпохі. У свой час Б.В.Асафьеў катэгарычна выступаў супраць распаўсюджвання музыкі, якая зніжае этычнае стаўленне да жыцця, адводзіць ад высокіх ідэалаў мастацтва. Ён заклікаў даць народу “шчодрай жменяй” жамчужыны музычнай класікі [1, с. 16–17].

Адной з умоў актывізацыі работы па маральна-эстэтычным выхаванні ў працэсе навучання з’яўляецца мадэліраванне ўласцівасцей асобы выпускніка музычнай спецыялізацыі. У ідэальнай мадэлі будучага спецыяліста ўтрымліваюцца патрабаванні грамадства да музычнага кіраўніка. Сама мадэль павінна вызначаць праграму арганізацыі і развіцця вучэбна-выхаваўчага працэсу ў ВНУ, усёй прафесійнай падрыхтоўкі студэнтаў. Тым самым ствараюцца ўмовы для распрацоўкі навукова абгрунтаваных планаў падрыхтоўкі спецыялістаў, выяўлення характару і зместу патрабаванняў пры прыёме ў ВНУ, аргументаванага адбору дысцыплін, уключаемых у вучэбны план, выяўлення неабходнага аб’ёму і паслядоўнасці іх вывучэння, устанаўлення

мэтазгодных узаемасувязей паміж дысцыплінамі і рознымі формамі работы са студэнтамі [3, с. 20–27]. А гэта, у сваю чаргу, забяспечыць сувязь з жыццём, з цяперашняй сацыяльна-культурнай сітуацыяй, з духоўнымі каштоўнасцямі, культывуемымі ў грамадстве.

---

1. *Асафьев Б.* Избранные статьи о музыкальном просвещении и образовании. – М.; Л.: Музыка, 1965.

2. *Кабалевсакий Д.Б.* Музыка и музыкальное воспитание. – М.: Знание, 1984. – 64 с.

3. *Макуренкова Е.П.* Влияние прогрессивных общепедагогических теорий на решение проблем музыкального образования // Актуальные проблемы музыкальной педагогики. Вып. 32. – М.: ГМПИ им. Гнесиных, 1987. – С. 20–27.

4. *Цыпин Г.М.* Музыкально-исполнительское искусство: теория и практика. – СПб.: Алетейя, 2001.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ